7. Мартынов С. Позиция Беларуси в ООН – это честный взгляд на мир // Рэспубліка, 2006., 7.02, с. 1-3.
8. Мальцев Л. Белорусская армия – основа военной безопасности нашего государства // Белорусская думка, 2006, № 1, с. 5-27.
9. Макаров В. Консциентальное оружие: вызов нового тысячелетия? Проблемы обеспечения национальной безопасности, безопасности сознания людей, интеллектуального ресурса нации, морального духа народа // Нёман, 2003, № 10, с. 169-171.
10. Никитина Ю. Внешнеполитические ориентиры Белоруссии в сфере безопасности: между НАТО и ОДКБ // МЭиМО, 2006, № 6, с. 77-80.
11. Павлов Н. Берлин-Москва: стратегия «нового реализма» // МЭиМО, 2004, с. 57-69.
12. Павлов Н. Нормальна «ненормальная» Германия // Международная жизнь, 2005, №11, с. 14-29.
13. Примаков Е. Россия вступила в 2005 год // Международная жизнь, 2005, № 3-4, с. 51-62.
14. Погорельская С. Некоторые аспекты европейской политики объединённой Германии // МЭиМО, 2000, № 1, с. 89-95.
15. Хохлов И. Развитие наркобизнеса в условиях контртеррористической операции в Афганистане // МЭиМО, 2006, № 6, с. 58-69.
16. Эрлер Г. Внешняя политика и политика безопасности Германии после войны в Косово // МЭиМО, 2000, № 1, с. 82-88.
17. Медведев А. Будущая война // Беларусь сегодня. 2006, 19.01, с. 11.
18. Федосенко В. Вместе спасаем // Беларусь сегодня. 2006, 19.01, с. 12.
19. Федорчук В. Беларусь – Германия: партнёрство – важный аргумент // Рэспубліка, 2006, 20.01, с. 11.

**Казлоў Л. Р.** (ген. дырэктар УП «Арты-Фэкс», г. Мінск)

## БЕЛАРУСЬ У ГЕРМАНСКАЙ КАРТАГРАФІІ (другая пал. XIX – першая пал. XX ст.)

Разглядаемы перыяд – час станаўлення і далейшага развіцця германскай нацыі, у якім патрэбна выдзяляць два асноўныя моманты. Па-першае, вядучую ролю адыграў навукова-тэхнічны прагрэс, заклаўшы падмуркі знакамітай “нямецкай якасці”, але, па-другое, германскае адзінства выразна насіла прускі акцэнт, рэйхавую гегемонію Гогенцолернаў, што стала агульнаеўрапейскім фактам, дзякуючы “жалезнаму канцлеру” Ота фон Бісмарку (1815 – 1898). Даволі хутка індустрыяльная ўпэўненасць падмацавала новыя планы адносна пашырэння тэрыторыі гэтай маладой і дынамічнай нацыі, тым болей, што ў самой Прусіі ніколі не забываліся пра ваенны гераізм продкаў. Таму не Прусія растварылася ў Германіі, а наадварот: Германія ў Прусіі. Такім чынам, сярод надзвычайна ўражлівых гаспадарчых поспехаў амаль адразу можна было разглядзець бляск германскага штыка, зробленага з першасортнай золінгенаўскай сталі. Заставалася толькі ўнутраныя дасягненні перанесці за межы дзяржавы.

У гісторыі Германіі значнае месца заўжды займалі пытанні адносін з Усходняй Еўропай, у прыватнасці, з Польшчай і Расіяй. Напэўна ўсім добра вядома, калі з Расіяй “то моцна сябравалі, то моцна ваявалі”. З-за гэтага і ў расійскай гісторыі мноства адзнак нямецкай культуры, ды шмат чаго іншага. Дарэчы, першыя крокі ў сапраўднай акадэмічнай навуцы Расія рабіла з дапамогай прафесароў, выхадцаў з розных германскіх мясцін. Што тычыцца картаграфіі, то ў гэтай галіне ў XVIII – першай палове XIX ст. амаль поўнасцю дамінуюць нямецкія прозвішчы: Л. Эйлер, А. Вільбрэхт, К. Аперман, П. Сухтэлен, К. Тэнер, В. Струве, Ф. Шуберт і інш. Практычна ў кожным са спецыяльных атрадаў Корпуса ваенных тапографаў (КВТ), якія рабілі здымкі ў заходніх губернях Расійскай імперыі, знаходзіліся т. зв. “астзейцы” [5; 28-150]. Нельга забываць і пра картаграфічныя праекцыі (папярэчна-цыліндрычную і інш.), якія звязаныя з імем знакамітага вучонага К. Гауса (1777-1855) [2; 56-61]. Пэўны станоўчы ўплыў на развіццё гаспадарчай культуры аказалі шматлікія перасяленцы з Нямеччыны. Так, на Берасцейшчыне ў пазамінулым стагоддзі з’явіліся населеныя пункты “Нейдорф” і “ Катэнборг” (зараз – “Кацін Бор”), а непадалёк ад Радашковічаў і зараз існуе вёска Карлсберг. Нярэдкасцю былі нямецкія сем’і на Палессі і ў розных беларускіх гарадах [9; т. 5, 320]. А яшчэ раней, у

сярэдзіне XVIII ст. картограф з Нюрнбергу Т. Майер на сваёй карце ўпершыню размясціў Белую Русь – “Russia Alba” па дыяганалі ад Берасцейскага да Полацкага ваяводства [16]. Пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай абодвух народаў (1795) Прускае каралеўства стала непасрэдна межаваць з Расіяй, г. зн., што Беларусь апынулася ў т. зв. “Заходняй пагранічнай прасторы”, і тут пачаліся інтэнсіўныя картаздымкі. Большую цікавасць да гэтай “прасторы” сталі праяўляць і з прускага боку, асабліва з другой паловы XIX ст.

Найболей раннім падрабязным прадстаўленнем заходніх зямель у складзе Расійскай імперыі лічыцца шматаркушовая спецыяльная тапаграфічная карта нямецкага картографа Г. Рэймана, працу над якой ён распачаў у 1806 г. Амаль праз семдзесят год яе набыў прускі Генштаб, але, нягледзячы на розныя ўдасканаленні і спраўленні, “рэйманаўская карта” безнадзейна састарэла [12; 9]. Тут трэба заўважыць адну цікавасць: Рэйман увёў у назву сваёй працы слова “Цэнтральная Еўропа” (Mitteleuropa). Гэта назва неаднаразова будзе фігураваць не толькі на нямецкіх картах, але і ў розных навуковых і папулярных выданнях. У сувязі з гэтым у абіход увойдзе пазней і ўсё тое, што на ўсходзе – “Ostland”, а канкрэтна да Беларусі – “Weiss-ruthenien”, якая з берлінскага пункту бачання з’яўлялася арганічнай часткай тэрыторыі “Ostland” [27, 31]. Асабліва гэта відочна ў армейскіх картаграфічных выданнях, пачынаючы з другой паловы XIX ст. У цывільных нямецкіх публікацыях у той жа час гэтая з’ява праяўлялася ў меншай ступені [18, 20, 21]. Шэраг аўтараў (М. Гоц, А. Томас, Г. Юнд, Ф. Энгельгарт), паказваючы ў сваіх аглядальных картах Заходнюю Расію, нярэдка ўжывалі назву “Літва” ці “Польшча” у старым гісторыка-геаграфічным сэнсе. Але паступова ідэя заваёвы “жыццёвай прасторы” (“Lebensraum”) на ўсходзе становіцца дамінуючай практычна ва ўсіх картографаў Рэйха. Канешне, прамога доказу ніхто не прыводзіў, на гэта толькі намякалася. Стратэгія і тактыка будучых ваенных дзеянняў распрацоўвалася на дасканалых картах недзе ў глыбінах прускага Генеральнага штаба (А. Шліфен).

Між тым, напрыканцы XIX ст. для шырокага выкарыстання ў Нямеччыне з’явілася бліскуча аддрукаваная каляровая “Аглядальная карта Цэнтральнай Еўропы” у трохкіламетровым маштабе [19]. І, хаця пазней крытыкі знойдуць у ёй розныя хібы ды тое, што для ўсходняй часткі некрытычна выкарытоўваліся расійскія матэрыялы [12; 10], карта застаецца каштоўнай крыніцай для гісторыі Беларусі, якая размясцілася на 24-х аркушах гэтай карты.

Вялікую асветніцкую ролю адыгралі у той час выданні Бібліяграфічнага Інстытута ў Лейпцыгу. Напрыклад, шырока вядомы “Гістарычны атлас” сярод мноства падрабязных карт і планаў, з адпаведнымі каментарыямі і храналогіяй, утрымлівае і матэрыялы аб Беларусі [20; 50]. У тым жа “Атласе”, дарэчы, аператыўна прадстаўлены тэатр руска-японскай вайны 1904-1905 гг. [20; 51]. Словам, шырокім колам давалася магчымасць з дапамогай карт сачыць за падобнымі падзеямі, а галоўнае – дасягалася мэта карыстання картаграфічнымі матэрыяламі. Адсюль – “карта за халявай у кожнага салдата” [3; 149]. Але найбольшым аператыўна-тактычным даляглядам у гэтай галіне валодаў афіцэрскі корпус, што фарміраваўся ў асноўным за кошт выхадцаў з Прусіі. Такім, напрыклад, з’яўляўся адзін з выдатных германскіх военачальнікаў Э. Людэндорф (1865-1957), які з пачаткам Першай сусветнай вайны (1914 – 1918) быў прызначаны галоўным кватэрмайстрам 2-й арміі, а потым стаў начальнікам штаба ўсяго Ўсходняга фронту і першым генерал-кватэрмайстрам вярхоўнага нямецкага камандавання. Менавіта ён “прыклаў руку” да паражэнняў і адступлення расійскай арміі ў жніўні 1914 і летняй кампаніі 1915 г. [6; 25]. Падкрэслім, што ў распрацоўцы такіх паспяховых аперацый веданне мясцовасці з дапамогай адпаведных картаграфічных матэрыялаў займала адно з вядучых месцаў.

Але на практыцы далёка не кожны ўдзельнік баявых эпізодаў на Ўсходнім фронце меў патрэбную карту. Тады германскае камандаванне пайшло на звычайны плагіят: стала проста перадрукоўваць расійскія “трохвярстоўкі” ды іншыя картаграфічныя матэрыялы сваіх праціўнікаў [22]. На аснове той жа “Ваенна-тапаграфічнай карты Еўрапейскай Расіі” (2-е выд., 1:126000) была спешна створана шматаркушовая “кіламетроўка” [23]. Усе падобныя выданні мелі этымалагічна-слоўнікавыя паясненні, якія дадрукоўваліся на бакавых палях кожнага аркуша. Тапаграфічныя кіламетровыя карты выдаваліся некалькімі пасамі – ад поўначы (Прыбалтыкі) да поўдня (Прычарнамор’я). Беларускія землі трапілі ў трэці і апошні – чацвёрты пас (прыкладна да Пінска), што адпавядала лініі прасоўвання германскіх войскаў. Надзвычайная хуткасць выпуску “кіламетровак” стала асноўнай прычынай недакладнасцей,

асабліва гіпсаметрычнага і тапанімічнага характару [12; 11]. З расійскага боку таксама спешна друкаваліся “вярстоўкі” і “дзьвюхвярстоўкі” для прыфрантавой паласы [3; 81-148], якія мелі бадзёры наддрук: “часовае выданне”. На самой справе ніхто не ведаў калі і дзе закончацца ваенныя дзеянні, а што тычыцца ваенна-тапаграфічных карт, то яны былі ў свабодным продажы (у асабістай калекцыі аўтара ёсць факсіміле аркуша “трохвястоўкі”, шэраг XV, ліст 5, са штэмпелем, на якім падаецца кошт карты ў Петраградзе – 50 кап.). Зразумела, што праз сваіх агентаў германскае камандаванне адразу ж атрымлівала такія выданні. Паралельна пашырылася колькасць тапаграфічных служб непасрэдна ў дзеючых арміях, удасканальвалася тэхніка (прымяненне аэрафотаздымкаў) [3; 152-155].

У 1914 – 1918 гг. для ваенных патрэб у Германіі, не зважаючы на магутныя рэсурсы, картавыдавецкая справа неаднаразова аказвалася на ўскрайку магчымасцяў. Прыходзілася друкаваць некаторыя карты нават на зваротным баку старых выданняў. У Берліне выдавалася толькі нязначная іх частка – стратэгічныя і аглядальныя карты, а падрабязныя – друкаваліся непасрэдна ў паходных літаграфіях. Германскія ваенныя тапографы выдалі тады 275 мільёнаў адзінак, а ўсяго ў карыстанні абарочвалася звыш 800 мільёнаў рознага кшталту картаграфічных аркушаў. Такім чынам, усеразбуральная вайна рэзка падняла колькасны ўзровень германскай картаграфіі [1; 32]. У якасці гістарычных крыніц нямецкая картаграфічная спадчына часоў Першай сусветнай вайны, якая непасрэдна закранула і Беларусь, застаецца важным элементам.

Пруская Германія, якая так імкнулася да гегемоніі ў свеце праз “бліцкрыгавыя” ваенныя дзеянні, на стадыёне гісторыі паказала сябе выдатным спрынтэрам, але дрэнным стаерам. Увосень 1918 г. яна пацярпела канчатковае паражэнне, кайзераўскі рэйх перастаў існаваць, а ў чэрвені 1919 г. Версальскі дагавор паставіў кропку ў так званай “еўрапейскай вайне”.

Хаця Германія фармальна прызнавалася прайграўшым бокам і несла за злоўчыненні адпаведную кару, яе асноўная індустрыяльна-тэхнічная база захавалася, як захавалася аснова прускага афіцэрскага корпуса, і недзе ў гэтым асяроддзі стане выспяваць мара аб рэваншу. Адной з галоўных ідэй Версаля, навязанай амерыканцамі, была ідэя дэмакратызацыі самой Германіі праз яе народ, які не жадаў больш вайны. Ды хутка стала ствараццa сітуацыя, калі толькі прамысловыя алігархі ды зямельная арыстакратыя маглі забяспечыць існаванне нацыі. Яны пры ўсялякім зручным моманце знаходзілі вінаватых, а былыя ваякі толькі і чакалі, каб “навесці парадак у краіне, патанаючай у дэмакратычным хаосе”. У такіх умовах, што пералічаны тут далёка не поўнасцю, моц стаў набіраць рух нацыянал-сацыялістаў на чале з Гітлерам. Пад лозунгам аднароднага **бескласавага** грамадства і імкнення да адзінства нацыі без усялякай асабістай свабоды, яны заваёўваюць усё большую падтрымку і ў студзені 1933 г. прыходзяць да ўлады. Пачаўся самы змрочны час германскай гісторыі, вынікам якога стала новая сусветная вайна [4; 83-85; 98-99].

Гэтым разам, здавалася, падрыхтоўка вялася намнога больш дасканала: ваенізаваная прамысловасць, ідэалогія, дыпламатыя, прапаганда, армія і адзінства народа, узмоцненае тэрорам. Дарэчы, і картазабеспячэнне было спачатку дастатковым. Тым не менш, як толькі з разгортваннем Другой сусветнай вайны ў верасні была захоплена Польшча, адразу знакамітая “вігаўская сотка” (польская тапакарта у кіламетровым маштабе) стала актыўна ужываным трафеем вермахта [26]. На яе аркушах з’явіўся надпіс: “Sonderausgabe! Nur fűr Dienstgebrauch!” (Спецыяльна для службовага карыстання!). Цікавасць узнікла не толькі да этнічна польскіх ваяводстваў, але і да “усходніх крэсаў” – Заходняй Беларусі, якая толькі што ўвайшла ў склад БССР. Занадта даверлівае стаўленне тагачаснага савецкага кіраўніцтва да патэнцыяльнага ворага, рэпрэсіі ў адносінах да вышэйшага камандавання, адсутнасць рэальнага забеспячэння войскаў і інш. – з бляскам выкарыстала нямецка-фашысцкае камандаванне на пачатковай стадыі плана “Барбароса”. Дастаткова сказаць, што нярэдка чырвонаармейскае камандаванне карысталася састарэлымі картамі, перарobленымі з дарэвалюцыйных часоў. Толькі пазней з’яўяцца больш дасканалыя топакарты (з надпісам “Сістэма каардынат 1942 года”), якія яшчэ доўга будуць сакрэтнымі. Таму, відаць, да гэтае пары вядуцца спрэчкі: чые ж карты былі лепшымі? [7; 81].

Вышэйшае германскае кіраўніцтва з пачаткам вайны супраць СССР надавала значэнне не толькі тыпова ваенным картаматэрыялам, але арганізавала і даволі шырокую картаграфічную прапаганду. Актыўна выдаваліся тэрытарыяльна-адміністрацыйныя карты з папярэднім [27] і новым дзяленнем “Остланда” [31], дзе Беларусь ізноў як у старых германскіх традыцыях насіла назву “Weissruthenien”.

Калі больш уважліва прыглядзецца да “Ostland-Verwaltungskarte” (стан межаў на 1 студзеня 1944 г.), то ад традыцыйнай тэрыторыі Беларусі адсякаліся: Ашмяншчына на карысць “Літвы” (мяжа ішла ля самай Смаргоні) і амаль усё Палессе, якое падпарадкоўвалася рейхскамісарыяту “Украіна” (параўнайце з “Этнаграфічнай картай беларускага племені” Я. Карскага). Беларусь падзялялася на акругі (Kreisgebiete), на чале якіх стаялі гебітскамісары, у Мінску знаходзіўся генеральны камісар. Апрача гэтага, у стратэгічна важных гарадах (Віцебск, Магілёў, Баранавічы і Мінск) размяшчаліся яшчэ гаўпткамісары [31].

Картаграфічныя службы германскіх узброеных сіл (Armee-Kartenstelle) у першую чаргу друкавалі падрабязныя планы буйных гарадоў і іх наваколля. Пацвярджэннем гэтага могуць служыць даволі вялікія па памерах схема [28] і дэталёвая (1:25000) карта мінскага наваколля [29]. На схематычным плане Мінска відочны разбураная частка горада, тэрыторыя гета, акупацыйныя назвы вуліц, дзейнічаючыя прадпрыемствы, але галоўная ўвага надаецца ваенным аб’ектам і службам. Некаторыя вуліцы носяць імёны тых грамадска-палітычных дзеячаў Беларусі, якіх немцы лічылі ворагамі бальшавізма.

Крыніцазнаўчую цікавасць прадстаўляе карта наваколля Мінска (Umgebung Minsk). Шматкаляровая, зробленая даволі якасна, тыповая тапаграфічная карта захавала, як не дзіўна, большасць тапанімаў даваенных часоў, перададзеных, праўда, па-нямецку (Sowch. Lekkerta, Sowch. Ludamont, Kolch. O.G.P.U., Kolch. Stalina). Ёсць і чыста нямецкія тлумачэнні: Höfe (двары), Schule (школа), Militar lg. (ваенны лагер). Легенда з умоўнымі знакамі надрукавана адпаведна патрабаванням нямецкай картаграфіі. Вялікая ўвага нададзена гіпсаметрыі рэгіёна: рэльеф рупліва перадаецца шматлікімі гарызанталямі і адзнакамі вышынь, што станоўча ўплывала на дзеянні артылерыі. Дасканаласць падобных картаграфічных твораў тлумачыцца шырокім выкарыстаннем германскім бокам аэрафотаздыкаў (гэта спецыяльна пацвярджаецца ў суправаджальным тэксце і схеме).

На жаль, не ўсе карты, выдадзеныя Германіяй падчас Другой сусветнай вайны, што тычацца тэрыторыі Беларусі, да гэтай пары з’яўляюцца даступнымі для навуковых доследаў і выкарыстання ў якасці крыніц. Тут яшчэ патрэбна пошукавая і бібліяграфічная праца, таксама, як і адпаведнае супрацоўніцтва з нямецкім бокам.


1. Бёльке. Военно-топографическая служба в германской армии в войну 1914 – 1918 гг. (пер. с немецк. В. Демьяновского). – М.: Изд. ВТУ Ген. штаба Красной Армии, 1939.
2. Берлянт А. М. Картография. – М.: Аспект-Пресс, 2002.
3. Глушков В. В., Долгов Е. И., Шаравин А. А. Корпус военных топографов Русской армии в годы первой мировой войны. – М.: ИПВиА, 1999.
4. Дроз Ж. История Германии (пер. с французск. Б.А. Шуринова). – М.: АСТ-Астрель, 2005.
5. Исторический очерк деятельности Корпуса Военных Топографов. – СПб., 1872.
6. Людендорф Э. Мои воспоминания о войне 1914-1918 гг., Т. 1 – 2 (пер. с немецк.). – М., 1923-1924.
7. Шаравин А.А., Молчанов В.В. Чьи топокарты были лучше? // Военно-исторический журнал. – 1990. – № 4.
8. Шерр И. Германия. История цивилизации за 2000 лет. Т. 1 – 2 (пер. с немецк.). – Мн.: ФЦП, 2005.
9. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. – Мн.: БелЭн, 1993-2003.
10. Köhler F. Beiträge aus dem 200jährigen Verlagschaffen in Gotha zur Entwicklung der Kartographie. Peterm. Geogr. Mitt., 1985.
11. Lencewicz S. Stan i potrzeby Polskiej Kartografji. – Warszawa, Bellona, 1919.
12. Sienkiewicz W. Słownik historii Polski. – Warszawa, Demart, 2005.
13. Szaniawska L. Mapy Królestwa Polskiego wydane w latach 1815 – 1915 w zbiorach Biblioteki Narodowej. Warszawa, BN, 1997.
14. Sydow-Wagners methodischer Schul-Atlas, 23 ed. 1888 – 1944.
15. Treitschke H. Politik, bd. 1-2. Lpz., 1897-98.
16. Mauero Tob. Mappa Geographica Regni Poloniae… Norimb., Hommanianos Heredes, A. MDCCV.
17. Reumann G. Topographischen Specialkarte von Mitteleuropa. 1:200000. 1806…
18. Engelhardt F. Karte von Ost-Preussen, Lithauen, West-Preussen…1:325000. – Berlin, bei S. Schropp & Compagnie, 1859.

19. Übersichtskarte von Mitteleuropa. 1:300000. Herausgegeben von Kartogr.Abteilung der Kgl. Preus. Landesaufnahme. 1896 –1900.
20. Meuers Historischer Handatlas. Lpz., BI, 1911.
21. Kettler J. Flemmings Kriegskarte. Das Russische Kriegsgebiet…1:2000000. – Berlin, Carl Flemming A.G., 1914.
22. Военно-топографическая карта Европейской России. 1:126000. (Трёхверстка). Karte des westlichen Russlands. Bearbeitet i. d. Kartogr. Abt. d. Stallv.Generalstabes d. Armee. 1914 – 1915.
23. Karte des westlichen Rußlands. 1:100000. Kartographische Abt. d. Königl.Preyss.Landes-Aufnahme. 1914.
24. Freytag G., Peucker K. Generalkarte von West-Russland … 1:15000000. Wien, Eigentum und Verlag von Artaria & Comp., 1915.
25. Der Sommerfeldzug gegen Russland (karte von Ludendorf).
26. Mapa taktyczna (wigowska). 1:100000. – Warszawa, WIG, 1921-1939.
27. Verwaltungsübersicht Weißrutheniens (beilage zur "Bevölkerungsstatistik Weißrutheniens"). – Berlin, Dahlem, 1942.
28. Plan der Stadt Minsk. 1:10000. Aufnahme und Druck: Armee-Kartenstelle, 1942.
29. Umgebung Minsk (Deutsche Heereskarte, Rußland). 1:25000. Kr. Kart. u. Verm. Art. Kauen. 1.44. [01.1944].
30. Этнографическая карта Белорусского племени. Сост. в 1917 году ординарный академик Е. Карский. – М.: Отд. прос. нац. менш., 1920.
31. Ostland Verwaltungskarte.Hersg. von Reichskomissar P.O.Ostland. [01.1944].

**Зубачевский В. А.** (ГПУ, г. Омск, Российская Федерация)

## СОВЕТСКО-ГЕРМАНСКИЕ ВОЕННО-ПОЛИТИЧЕСКИЕ ОТНОШЕНИЯ (1920 – 1923 гг.)

В конце XX – начале XXI вв. российские и белорусские историки ввели в научный оборот новые документы о советско-германских военно-политических отношениях в 1920-е годы. Большинство учёных оценивают эти отношения как позитивное явление в борьбе против "санитарного кордона", созданного версальскими миротворцами для изоляции Германии и Советской России, но исключают наличие военно-политического союза названных стран. Однако некоторые историки придерживаются другого мнения. Автор разделяет первую точку зрения. Её подтверждает, в частности, история советско-германских отношений в 1920 – 1923 гг., на которые пришлись основные военные и революционные конфликты в Центральной Европе.

Уже события 1920 г. поставили под сомнение прочность буфера-кордона. Так, Германия надеялась использовать нападение Польши на советские республики для ревизии Версальского договора. К интересному выводу пришел в феврале 1920 г. Президиум Рады Белорусской Народной Республики: в связи с политикой Польши в «Белоруссии и [на] Украине, с враждебным отношением к ней России и Германии легко придти к заключению о скорой гибели Польши, а может быть и четвёртому разделу… большевики… умышленно отступали, чтобы дать возможность похозяйничать полякам в Белоруссии и тем разжечь ненависть к полякам … через месяц-полтора большевики разобьют поляков» [1]. Позицию благоприятного для Советской России нейтралитета заняла и Чехословакия, о чём напомнил в феврале 1921 г. уполномоченный РОКК в ЧСР С. И. Гиллерсон наркому иностранных дел Г. В. Чичерину [2; Ф. 04. Оп. 43. П. 274. Д. 53929. Л. 2]. О намерении вступить в 1920 г. в переговоры с Москвой признался в 1924 г. полпреду в Праге К. К. Юреневу президент ЧСР Т. Масарик [2; Ф. 04. Оп. 43. П. 278. Д. 53971. Л. 100]. На советско-литовских переговорах обсуждались даже совместные военные действия против Польши [3; Ф. 325. Оп. 2. Д. 26. Письма председателя делегации на переговорах с Литвой А. А. Иоффе – председателю РВСР Л. Д. Троцкому. 15 мая, 25 июня 1920 г. Л. 73, 76].

Вероятные шаги Германии в связи с советско-польской войной рассматривали немецкие военные и дипломаты. Июльские (1920 г.) записи сотрудников IV (восточного) отдела МИД Германии и командующего рейхсвером генерала Г. Секта свидетельствуют, что с приближением Красной Армии к русско-германской границе 1914 г. идея возврата "области Коридора"